# ВЫЗВАЛЕННЕ г. ГРОДНА АД НЯМЕЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Банцэвіч В. В.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт
г. Гродна, Беларусь

**Навуковы кіраўнік – канд. гіст. навук Чарнякевіч І. С.**

**Уводзіны.** Перыяд Вялікай Айчыннай вайны стаў выпрабаваннем трываласці і мужнасці нашага народа. Гэта вайна – адна з трагічных старонак у гісторыі нашай краіны: гібель столькіх людзей – ні з чым не параўнальная страта. У 2024 г. спаўняецца 80 год з моманту вызвалення горада Гродна.

**Мэта працы**. Вызначыць спецыфіку вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пры вывучэнні дадзенай тэмы у адпаведнасці зназванай мэтай былі вылучаны наступныя **задачы**:

1. Прааналізаваць, як праходзіла вызваленне Гродна і яго ваколіц.
2. Вызначыць наступствы вызвалення горада.

**Аб’ектам** дадзенага даследвання з’яўлюцца дзеянні Савецкай Арміі па вызваленню Гродна пад час правядзення аперацыі "Баграціён". Прадметам з’яўляецца непасрэдна працэс вызвалення г. Гродна.

**Метадычная аснова** – вывучэнне крыніц, рэтраспектыўны аналіз крыніц па тэме, таксама выкарыстанне метаду цэласнага і сістэмнага падыходу, правядзенне паралелей і аналогій.

Сярод шматлікай літаратуры па тэме трэба адзначыць манаграфію гродзенскага краязнаўцы Дзмітрыя Люціка «Нёманскі фронт 15-25 ліпеня 1944 г.» [2]. Гэтая манаграфія цалкам прысвечана правядзенню аперацыі "Баграціён" – Беластоцкай франтавой аперацыі на Гродзеншчыне. У кнізе прадстаўлены як архіўныя матэрыялы, так і ўспаміны ўдзельнікаў вайны. Храналагічны перыяд, які ахоплівае работа, – гэта ліпень 1944 г. – завяршальны этап у правядзенні аперацыіі "Баграціён".

У Беластоцкай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі, у ходзе якой быў вызвалены г. Гродна, удзельнічалі войскі 2-га Беларускага фронту (генерал-палкоўнік Захараў Г. Ф.), у складзе 3-й (генерал-палкоўнік Гарбатаў А. В.), 49-й (генерал-лейтэнант Грышын Т. И.), 50-й (генерал-лейтэнант Болдзін І. В.) і 4-й паветранай (генерал-палкоўнік авіяцыі К. А. Вяршынін) армій [2, с. 137].

Увечары 15 ліпеня 1944 г. з усходу да г. Гродна падышлі перадавыя 153 стралковай дывізіі 69 стралковага корпуса 50 арміі. Камандзір



Репозиторий ГрГМУ

дывізіі палкоўнік А. А. Шчачыннікаў загадаў не затрымліваецца і наступаць ў накірунку Каложскай царквы. Адначасова з ўсходу ў горад уварваліся часці 290 і 95-й стралковай дывізіі 81 стралковага корпуса (камандзір корпуса – гвардыі маёр Ф. Д. Захараў) [2, с. 139].

У цэнтры горада наступаў 882 полк пад камандаваннем палкоўніка Ф. М. Сцефаненка. Батальёны выйшлі ў раён Барысаглебскага манастыра.

На досвітку 16 ліпеня баі ў паўночнай частцы Гродна скончыліся. Немцы працягвалі абстрэл цэнтра горада і вакзала з-за ракі Нёман. Яны кантралявалі Занёманскі фарштат. Увесь дзень працягвалася перастрэлка.

У ходзе баёў за горад 352-я стралковая дывізія данесла аб 5 знішчаных нямецкіх танках. 174-я дывізія падбіла тры нямецкія САУ. Невядома, якой частцы належылі танкі і САУ, магчыма, гэта былі бронетранспарцёры 5-га разведбата [2, с. 245].

16 ліпеня 174-я стралковая дывізія атрымала загад здаць свае пазіцыі падраздзяленням 50-й арміі і выйсці ў раён на поўнач Гродна, да мястэчка Гожа, дзе і адбывалася пераправа частак 31-й арміі праз раку Нёман.

Увечары, у 23.00, 16 ліпеня ў гонар вызвалення Гродна ў Маскве быў дадзены салют 20 залпамі з 224 гармат [2, с. 246].

Такім чынам, баі за горад характарызаваліся імклівым напорам савецкіх частак. Немцы, фактычна, не абаранялі горад. Як было бачна, усе іх пазіцыі праходзілі па яго межамі. Баі ў горадзе вяліся толькі нешматлікімі нямецкімі падраздзяленнямі, якія не паспелі адступіць на левы бераг Нёмана. У наступныя дні ішлі цяжкія баі па ўтрыманню плацдарму ў занёманскай частцы горада і толькі раніцай 24 ліпеня, калі, адбіўшы мойны контрудар фашыстаў на левабярэжжы Немана, нашы войскі ўзнавілі наступленне, яна была ачышчана ад ворага.

А. Кулакоў, ветэран вайны, гвардыі падпалкоўнік ў адстаўцы распавядаў: "Фашистское командование поспешно перебросило в район Гродно из Германии мощное подкрепление. На берегах Котры неприятель оказал довольно сильное сопротивление, но все же эта река была форсирована нашими передовыми частями сравнительно легко. Лесистая местность позволила незаметно сосредоточить в заранее намеченных пунктах пехоту и артиллерию Привалова, Захарова, Полевика, Стриженко и других командиров." [1, с. 231].

На жаль, тое выгаднае становішча не ўдалося выкарыстаць, бо перад пачаткам аперацыі Г. Жукаў змяніў напрамак удару 3-га кавалерыйскага корпуса і 3-й арміі, з раёна Беластока на Аўгустоў. Немцы не ўпусцілі магчымасці выкарыстаць гэты шанец ліквідаваць плацдарм і акружыць 3 кавалерыйскі корпус і часткі 69-га стралковага корпуса



Репозиторий ГрГМУ

(42 і 153 с.д. ). Кантрудар пачалі часткі 3-й танкавай дывізіі СС "Мёртвая галава" – да 120 танкаў у 11 гадзін 18 ліпеня. Удар прыйшоўся на левы фланг Савецкіх войскаў і 42-я стралковая дывізія была змята. У акружэнні апынуліся 1 і 2 батальёны 435-га стралковага палка 42-й стралковай дывізіі. Намеснік камандзіра палка па страявой частцы маёр М. В. Сідарэц аб'яднаў салдат і ўмацаваўся на форце № 1. Заняўшы кругавую абарону, байцы супраціўляліся да 20 ліпеня. Акрамя іх, у асяроддзі апынулася рота 1-й штурмавой інжынерна-сапёрнай брыгады [1, с. 241].

Камандуючы 50-й арміяй генерал-палкоўнік І. В. Болдзін трымаў сітуацыю з 42-й дывізіяй на асобным кантролі. Але толькі 8 салдат з гэтай апошняй групы змаглі выратавацца з руін 1-га фарта [1, с. 254].

Раніцай 24 ліпеня, пасля ўпартых баёў і адбіцця магутнага контрудару праціўніка была поўнасцю вызвалена левабярэжная занёманская частка горада [3, с. 1].

За гады фашысцкай акупацыі, якая працягвалась з 23 чэрвеня 1941 г. па 16 ліпеня 1944 г., у Гродна, па дадзеных Надзвычайнай дзяржаўнай камiсcii, было знішчана 33 тысячы жыхароў, агульныя страты перавысілі 252,3 млн рублёў [1, с. 438].

Горад пасля вызвалення яго часткамі Чырвонай Арміі ляжаў у руінах. Поўнасцю былі разбураны тытунёвая фабрыка і велазавод, лесапільны і фанерны заводы, паравознае дэпо і водапомпавая станцыя, паштамт і вакзал, педвучылішча і Дом піянераў, спалена багатая бібліятэка настаўніцкага інстытута, пашкоджаны будынкі школ і бальніц, выведзена са строю 25 працэнтаў жылля.

17-ці воінскім часцям і злучэнням было прысвоена званне "Гродзенскіх". Імёнамі многіх вызваліцеляў горада названы вуліцы, школы, памежныя заставы, а Гродна ў ліку іншых населеных пунктаў Беларусі быў узнагароджаны вымпелам "За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны" [3, с. 1].

**Вынікі.** Уклад Беларусі ў барацьбу з фашысцкай ваеннай машынай агульнапрызнаны ва ўсім свеце. Беларусы першымі прынялі на сябе вераломны ўдар нямецкіх агрэсараў: звыш мільёна чалавек змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, вялі жорсткую барацьбу на акупаванай ворагам тэрыторыі. Тысячы беларускіх партызан і падпольшчыкаў у вельмі складаных умовах фашысцкай акупацыі вялі несупынную барацьбу. У тым ліку і горад Гродна, які ў выніку упартага супраціўлення выйшаў пераможцам.

Розныя даследчыкі ў некаторых выпадках па-рознаму глядзяць на тыя ці іншыя факты. У дадзенай працы мною зроблена спроба нейкага абагульнення назапашанага матэрыялу і прывядзенне яго ў сістэму.



Репозиторий ГрГМУ

**Літаратура**

1. Гродненщина накануне и в годы Великой Отечественной войны (1939-1945 гг.) (по док. гродн. архивов) / сост. Г. А. Адросенко [и др.]. – Гродно, 2005. – 600 с.
2. Люцік, Д. Нёманскі фронт 15-25 ліпеня 1944 г. Баі за Гродна: аналіз падзей, данясенні, успаміны, статыстыка / Д. Люцік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2012. – 324 с.
3. Пераможны ліпень 1944-га [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://svisgaz.by/news/70let/4429-peramozhny-lpen-1944-ga.html. – Дата доступа: 25.02.2024.

# ОККУПАЦИЯ ПОСЕЛКА ДРОЗДЫ ВО ВРЕМЯ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

**Баранова А. С.**

Гродненский государственный медицинский университет
г. Гродно, Беларусь

**Научный руководитель – Степанова Е. Ф.**

**Введение.** Одним из самых первых концентрационных лагерей на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны стал концентрационно-фильтрационный лагерь «Дрозды». В белорусской исторической науке оккупационная немецкая политика исследуется многими учеными, однако лагерь «Дрозды» недостаточно исследован в научной литературе, чем и вызывает интерес к этой проблеме.

**Цель.** Рассмотреть статус и функции концлагеря в общей системе фашистских лагерей, проанализировать события, происходящие в концлагере «Дрозды».

**Материалы и методы.** Основные научные методы: анализ, синтез, типологизация.

**Результаты и их обсуждение.** Политика немецкого командования на оккупированных белорусских территориях регламентировалась планом «Ост», согласно которому белорусские города планировалось превратить в опорные пункты немецкой колонизации, уничтожив при этом 75% белорусов. На оккупированной территории Беларуси немецким руководством было создано более 260 лагерей смерти вместе с их филиалами и отделениями. Под оккупацией оказались около 8 млн жителей, а также около 900 тысяч советских военнопленных.



Репозиторий ГрГМУ